Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

1 ЖНІЎНЯ 2017 г. АЎТОРАК №145 (28509)

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



## Прапановы турсезона

СТАР. 6



## Вяртаючы былую славу

СТАР. 9



## Дзевяць кветак і крынічная вада

СТАР. 13

# Раніца. Туман. Нёман



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Пасля нядаўняга ліўня рака Нёман каля вёскі Касцяшы Уздзенскага раёна выйшла з берагоў, затапіла пойменныя лугі. І мясцоваму конюху Андрэю КІМУ даводзіцца пераадольваць водныя перашкоды, пераганяючы свой табун на новую пашу.

### ЦЫТАТА ДНЯ



**Станіслаў ЗАСЬ, дзяржаўны сакратар Савета бяспекі:**

*«У цэлым краіна ўступіла ва ўборачную кампанію дастаткова арганізавана. Сельскагаспадарчым работам папярэднічала падрыхтоўка, у тым ліку з боку праваахоўнікаў. Але такі важны для аграрыяў этап не абыходзіцца без праблем. Так, фіксуюцца выпадкі безгаспадарлівасці, якія становяцца прычынай псавання тэхнікі, страты часткі ўраджаю. Вінаватыя панясуць за гэта адказнасць».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 01.08.2017 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 1,9442 | ▲ |
| Еўра | 2,2816 | ▲ |
| Рас. руб. | 0,0323 | ▼ |
| Укр. грыўня | 0,0752 | ▲ |

ISSN 1990 - 763X

17145

■ Еўрагульні. Чакаем разам

## Звярок, цацка ці чалавек?

### Хто будзе ўвасабляць Еўрапейскія гульні ў Мінску?

**Здаецца, яшчэ нядаўна наша краіна атрымала права на правядзенне гэтага вялікага спартыўнага турніру, а сёння падрыхтоўка да яго ідзе ўжо поўным ходам. Распрацаваны лагатып, прадумваецца праграма спаборніцтваў, набіраюцца валанцёры і... аб'яўлены конкурс на стварэнне талісмана Еўрагульняў, у якім можа прыняць удзел любы ахвотны. Для гэтага трэба прыдумаць ідэю талісмана, яго малюнак і імя. Заяўкі прымаюцца да 15 лістапада 2017 года (на электронную пошту info@mininform.gov.by, у тэме ліста неабходна пазначыць «Конкурс»). Уладальнікі першых трох прызавых месцаў атрымаюць запрашальныя білеты на мерапрыемствы II Еўрапейскіх гульняў, а таксама камплекты парадна-спартыўнай экіпіроўкі беларускай зборнай.**

СТАР. 8

## МЕДЫЯДЖУНГЛІ: правілы выжывання,

### або Як не трапіць у інфармацыйную пастку

**Усяго некалькі дзясяткаў гадоў таму паток медыяінфармацыі быў абмежаваны трыма-чатырма тэлеканаламі, цэнтральнымі газетамі і некалькімі часопісамі. А сёння ўсе мы знаходзімся ў медыяпалоне амаль круглыя суткі. Інтэрнэт, сацыяльныя сеткі, рэклама, камерцыйныя аб'явы, тэленавіны, кінафільмы, музыка, мноства радыёстанцый... Аўтаматычныя сэрвісы падказваюць нам, што купіць і дзе, у якую турфірму звярнуцца, з кім пазнаёміцца, што пачытаць... Медыя інтэграваныя ў наша жыццё настолькі, што большасць паведамленняў мы атрымліваем у фонавым рэжыме, не звяртаючы на іх увагі.**

СТАР. 4–5




Фота Надзеі БУЖАН.

Да 100-годдзя «Звязды» засталося 8 дзён

**На ўсе 100!!!**

100 гадоў пішам пра тое, што сапраўды важна.
Заставайцеся з намі – будзе цікава!
Падпісацца на «Звязду» можна заўсёды.